Download



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Вынесены прысуд 25-гадоваму Аляксею Мальцаву, якога вінавацілі ў актыўным удзеле ў групавых дзеяннях, што груба парушалі грамадскі парадак (ч. 1 арт. 342 КК), за падзеі 13 верасня 2020 года, а таксама замаху на крадзеж (ч. 1 арт. 14 ч. 2 арт. 205 КК).

Мужчыну вінавацілі ў тым, што ён 13 верасня ў стане алкагольнага ап’янення выйшаў на балкон, пабачыў пратэстоўцаў, выкрыкваў лозунг «Жыве Беларусь», пасля заклікаў пратэстоўцаў далучыцца — выйшаў на вуліцу і прыняў удзел у несанкцыянаваным мітынгу. Ішоў з іншымі людзьмі па праезнай частцы дарогі да Мінск-Арэны, чым перашкаджаў руху транспарту і працы прадпрыемстваў, а калі падыйшоў да перашага шэрагу супрацоўнікаў міліцыі — паказваў ім непрыстойныя жэсты. На пытанне, навошта так рабіў, абвінавачаны адказаў, што глядзеў відэа з пратэстаў, як людзей білі. У той вечар быў затрыманы каля ст. м. «Пушкінская», але яго вывезлі за горад на мікрааўтобусе і выпусцілі. Аднак у кастрычніку за падзеі 13 верасня асудзілі на 15 сутак арышту.

У выніку суддзя Алена Бушава прысудзіла Аляксею 3 гады з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Падрабязнасці bit.ly/2XyJP4p
t.me/viasna96/6662
4.5K viewsedited Aug 14, 2021 at 12:01

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy